ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (1047) ● Чацвер, 28 сакавіка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

Лўген Макарэвіч і Наталля Вялічка — студэнты III курса хімічнага факультэта. Нядаўна рашэннем бюро камітэта камсамола яны ўзнагароджаны значком «За выдатную вучобу».

Сёння ж у рабят— звычайны працоўны дзень.



## ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

**На здымках:** у Наташы Вялічка заняткі па фізічнай хіміі, а ў Жэні Макарэвіча — па арганіцы.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



## НАСУСТРАЧ XVII КАМСАМОЛЬСКАМУ

Кіруючыся рашэннем сакратарыята ЦК ЛКСМБ, бюро камітэта камсамола універсітэта прыняло пастанову аб правядзенні ва ўсіх пярвічных арганізацыях камсамольскіх сходаў з павесткай дня «Аб выніках XXV з'езда ЛКСМ Беларусі і задачах па далейшаму паляпшэнню камуністычнага выхавання моладзі».

Сходы прайшлі ўжо на філалагічным факультэце і ФПМ, у многіх групах і на курсах юрыдычнага, геаграфічнага, фізічнага і гістарычнага факультэтаў.

Былі абмеркаваны задачы, якія вынікаюць з рашэнняў XXV з'езда, прамовы другога сакратара ЦК КПБ тав. А. Н. Аксёнава.

На сходах прысутнічалі ветэраны партыі і працы, выступала дэлегатка XXV з'езда камсамола Беларусі студэнтка філфака Л. Тарасюк.

## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ

Калі ўважліва прачытаць усе аб'явы на пятым паверсе галоўнага корпуса, можна даволі добра ўявіць, чым жыве сёння гістарычны факультэт. Бадай, самыя яскравыя, самыя маляўнічыя аб'явы належаць СБА. Яны заклікаюць байцоў з'явіцца на першыя атрадныя сходы, абавязваюць неадкладна прайсці медагляд... Ідзе падрыхтоўчы перыяд працоўнага семестра-1974.

На мінулым тыдні закончылася фарміраванне студэнцкіх будаўнічых атрадаў гістарычнага факультэта. У гэтым годзе іх «геаграфія» такая: атрад імя Эрнеста Чэ Гевары накіруецца ў Томскую вобласць, атрад «Вікторыя-74» — ва Уральскую, атрад імя Шмырова—у Малдавію. Самы блізкі, але не менш напружаны фронт работы—у гарадскога атрада імя Ленінскага камсамола.

Ва ўсіх атрадах прайшлі першыя сходы, на якіх выбран актыў, праведзена падпіска на «Студэнцкі мерыдыян», вырашаны пытанні з формай і эмблемамі. Камандзіры і камісары азнаёмілі байцоў са статутам СБА, зацвердзілі планы работы атрадаў у падрыхтоўчы перыяд.

**Т. ЛЕАНКОВА.**

**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

*НА ПАРОЗЕ САМАСТОЙНАСЦІ*

## ІДЗЕ РАЗМЕРКАВАННЕ

З 13 сакавіка ва універсітэце ідзе размеркаванне выпускнікоў па месцах іх будучай работы. Першымі перад камісіяй прайшлі філолагі, выпускнікі рускага аддзялення. Добрая падрыхтоўка ўсёй дакументацыі, дакладнае і рознабаковае прадстаўленне кожнага пяцікурсніка, якое рабіў намеснік дэкана М. М. Піпчанка, пакінулі добрае ўражанне і дазволілі зладжана правесці гэты адказны дзень.

Выдатная вучоба, актыўная навуковая і грамадская работа далі права размяркоўвацца першымі Таццяне Чайко, Людміле Паленавай, Але Вернікоўскай. Т. Чайко падпісала накіраванне ў Дзяржынскі раённы аддзел народнай асветы, Л. Паленава — у Пухавіцкі. Яшчэ 77 маладых настаўнікаў пачнуць свой першы навучальны год у школах Драгічынскага, Івацэвіцкага, Іванаўскага, Камянецкага, Лунінецкага, Горацкага, Глускага, Полацкага і іншых раёнах рэспублікі 28 выпускнікоў атрымалі права на самастойнае ўладкаванне на работу.

У Любанскі, Старадарожскі, Воранаўскі, Баранавіцкі, Кобрынскі, Талачынскі і іншыя раёны паедуць працаваць выпускнікі беларускага аддзялення.

Вызначаны ўжо месцы работы выпускнікоў геафака, біяфака, хімфака. На чарзе гісторыкі, філосафы і палітэканомы, журналісты і фізікі.

**М. МАЦЕЙКА.**

Калі б у сутках было і больш 24 гадзін, то ўсё роўна Тамары не хапала б часу. Лекцыі, справы ў партбюро, потым — нарада ў камітэце камсамола.

Толькі год узначальвае Тамара Краўцова, студэнтка IV курса юрыдычнага факультэта, інтэрсектар камітэта камсамола універсітэта. Ужо ёсць некаторыя поспехі. Калі дзяўчына расказвае аб рабоце сектара, то абавязкова ўспомніць сваіх добрых памочнікаў Сашу Якубава і Люду Шарпан. Гэта і іх намаганнямі праводзяцца цікавыя вечары інтэрнацыянальнай дружбы, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы.

**На здымку:** на пярэднім плане **Т. Краўцова.**



## УВАГА! ЗАПРАШЭННЕ НА ЗАНЯТКІ

29 сакавіка ў 16 гадзін у аўдыторыі № 206 (галоўны корпус) адбудуцца заняткі ў «Школе народных кантралёраў» універсітэта. З лекцыяй «Формы і метады работы груп народнага кантролю» выступіць намеснік загадчыка аддзела арганізацыйнай работы Камітэта народнага кантролю БССР А. С. Бурак.

На заняткі неабходна з'явіцца ўсім членам груп народнага кантролю.

## АЛЕ І АБАВЯЗАК

### Народны КАНТРОЛЬ

Быць народным кантралёрам — высокі гонар. Але разам з тым гэта і адказны абавязак. Ён патрабуе праяўлення волі, настойлівасці, прынцыповасці, шырокіх і рознабаковых ведаў, творчых пошукаў лепшых прыёмаў здзяйснення кантролю, найбольш дзейсных сродкаў ліквідавання выкрытых недахопаў, шырокага распаўсюджання станоўчага вопыту.

Поспех у рабоце народных кантралёраў у многім залежыць ад іх сістэматычнай і настойлівай вучобы, ад удасканалення практычнага майстэрства.

У выніку выбараў, якія праходзілі ва універсітэце ў снежні мінулага года, састаў народных кантралёраў абнавіўся больш чым напалову. Народнымі кантралёрамі выбраны перадавыя, найбольш актыўныя выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты як камуністы, так і беспартыйныя. Новы састаў груп горача ўзяўся за работу: намецілі добрыя планы і пачаў праводзіць праверкі. Аднак першыя месяцы работы паказалі, што ў многіх кантралёраў не хапае спецыяльных ведаў па тэорыі і практыцы кантралёрскай работы. Праверкі праведзены, затрачан дарагі час, а вынікаў, якіх чакалі, няма.

У. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў, што майстэрства кіравання набываецца шляхам сістэматычнай настойлівай вучобы і практычнага ўдзелу ў кіраванні.

Каб дапамагчы народным кантралёрам правільна, мэтанакіравана і рэзультатыўна праводзіць праверкі, вырашана на чарговых занятках у «Школе народных кантралёраў» разгледзець формы і метады работы груп народнага кантролю. Размова пойдзе аб тым, як правільна падрыхтаваць і правесці праверку, «дакапацца» да прычын тых або іншых недахопаў і упушчэнняў у рабоце, знайсці асоб, якія не прытрымліваюцца сваіх службовых абавязкаў. Правільная арганізацыя праверкі абавязкова прадугледжвае, што кантралёры звяртаюць увагу не толькі на недахопы, промахі і памылкі ў рабоце, але і на станоўчы вопыт, які заслугоўвае ўсямернай падтрымкі і ўдасканалення на іншых участках работы.

Вучоба народных кантралёраў — абавязак. І яго неабходна непахісна прытрымлівацца. Патрэбна адзначыць, што ў мінулыя гады не ўсе народныя кантралёры філалагічнага, юрыдычнага, геаграфічнага, матэматычнага факультэтаў рэгулярна наведвалі заняткі ў «Школе народных кантралёраў» універсітэта.

Мы будзем весці строгі ўлік наведвання заняткаў і прыцягваць да адказнасці як старшынь факультэцкіх груп народнага кантролю, так і саміх кантралёраў, якія ўхіляюцца ад вучобы.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**намеснік сакратара парткома, старшыня групы народнага кантролю БДУ.**

# ГУЧЫЦЬ СЛОВА...

Адбыўся трэці, заключны тур агляду-конкурсу самадзейных дэкламатараў-выканаўцаў. На працягу трох з паловай гадзін са сцэны гучалі вершы.

Камітэт камсамола БДУ і праўленне студэнцкага клуба—арганізатары гэтага конкурсу—ставілі перад сабой задачу выявіць здольных дэкламатараў на факультэтах. Вопыт апошніх гадоў паказаў, што жанр дэкламацыі з'яўляецца слабым месцам у мастацкай самадзейнасці многіх факультэтаў.

Рашэннем камісіі першае месца прысуджана студэнтцы факультэта прыкладной матэматыкі Л. Дубікавай, другое — А. Касцецкаму, студэнту гістарычнага факультэта, трэцяе — студэнтцы факультэта журналістыкі О. Ягоравай. Граматай узнагароджан калектыў выканаўцаў літаратурна-мастацкай кампазіцыі аб Пушкіне (біялагічны факультэт). Акрамя таго, яшчэ 12 удзельнікаў адзначаны заахвочвальнымі прэміямі.

Перамога выхаванцаў універсітэцкай тэатральнай студыі Л. Дубікавай і А. Касцецкага не была нечаканай. Яны і ў студэнцкім тэатры іграюць вядучыя ролі. Журы, якое ўзначальваў заслужаны артыст Латвійскай ССР А. М. Озераў, аднадушна выставіла ім самыя высокія адзнакі. Аднак О. Ягоравай сур'ёзную канкурэнцыю саставіў студэнт гістарычнага факультэта В. Маставец, адзначаны заахвочвальнай прэміяй.

Трэба сказаць, што гістарычны факультэт наогул добра падабраў удзельнікаў агляду.

Цяпер, калі вынікі конкурсу ўжо падведзены і сталі вядомымі імёны пераможцаў, можна з упэўненасцю сказаць, што пастаўленая задача вырашана паспяхова. Канешне, не абышлося без асобных «выдаткаў». Так, напрыклад, юрыдычны, матэматычны і геаграфічны факультэты не выставілі сваіх дэкламатараў. Член журы актрыса Тэатра юнага гледача С. Скальская адзначыла аднабаковасць у падборы рэпертуару. Гэта, у прыватнасці, выразілася ў тым, што ўдзельнікі конкурсу амаль не чыталі лірычных і сатырычных твораў.

У цэлым жа конкурс паказаў, што факультэцкія калектывы самадзейнасці маюць здольных дэкламатараў, і ў аглядзе мастацкай самадзейнасці, які мае адбыцца, яны парадуюць гледачоў творчымі ўдачамі.

**Ю. ШЫНКАР,**
**загадчык культмасавага сектара камітэта камсамола БДУ.**



Заняткі па французскай мове ў студэнтаў II курса гістарычнага факультэта часта праходзяць тут, у спецыяльна абсталяваным кабінеце.

Ідзе праслухоўванне грамадска-палітычных тэкстаў. Вядзе заняткі старшы выкладчык **Г. І. Нікалайчык.**

Фота **Д. Чаховіча.**



# ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА

## (З ПАЛАЖЭННЯ АБ ПЕРСАНАЛЬНЫМ РАЗМЕРКАВАННІ)

Маладыя спецыялісты, якія закончылі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з адрывам ад вытворчасці, накіроўваюцца ў адпаведнасці з планам міжведамаснага і міжрэспубліканскага размеркавання на работу па спецыяльнасці і кваліфікацыі, набытымі імі ў навучальнай установе.

Прадастаўленне работы маладым спецыялістам у планавым парадку — адна з гарантый забеспячэння права грамадзян СССР на працу, устаноўленага артыкулам 118 Канстытуцыі СССР. Работа ў адпаведнасці з назначэннем — грамадзянскі доўг маладога спецыяліста.

Пры вызначэнні месцаў работы маладых спецыялістаў міністэрства (ведамствы) павінны ўлічваць даныя ім рэкамендацыі аб найбольш мэтазгодным выкарыстанні маладых спецыялістаў.

Персанальнае размеркаванне маладых спецыялістаў на работу праводзіцца камісіяй, зацверджанай міністэрствам або ведамствам.

Камісія па персанальнаму размеркаванню забяспечвае:

а) выкананне плана міжведамаснага і міжрэспубліканскага размеркавання маладых спецыялістаў;

б) прадастаўленне работы ўсім выпускнікам у адпаведнасці са спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, набытымі ў навучальнай установе, з улікам атрыманай імі спецыялізацыі, акадэмічнай паспяховасці, сямейных абставін, стану здароўя, а таксама ўдзелу ў навукова-даследчай і грамадскай рабоце;

в) першачарговае накіраванне маладых спецыялістаў на прадпрыемствы, будоўлі і пускавыя аб'екты, якія маюць вострую патрэбу ў кадрах спецыялістаў.

Кожнаму маладому спецыялісту камісія паведамляе аб месцы работы (прадпрыемства або арганізацыя, гарадское (раённае) упраўленне або аддзел і г. д.), аб пасадзе, размеры заработнай платы, відзе прадастаўляемай жыллёвай плошчы. Камісія заслухоўвае і абмяркоўвае таксама асабістыя пажаданні маладога спецыяліста аб яго будучай рабоце.

Маладыя спецыялісты, якія не з'явіліся без уважлівых прычын у камісію па персанальнаму размеркаванню, размяркоўваюцца завочна.

Нязгода маладога спецыяліста з рашэннем камісіі па персанальнаму размеркаванню не вызваляе яго ад прыбыцця на работу па назначэнню.

Маладыя спецыялісты, якія маюць інваліднасць першай або другой групы, накіроўваюцца на работу з улікам стану іх здароўя па месцу пастаяннага жыхарства сям'і або з іх згоды на адно з месцаў, прапанаваных камісіяй.

Маладым спецыялістам, якія маюць бацькоў-інвалідаў першай або другой групы, пры адсутнасці ў сям'і іншых працаздольных членаў работа прадастаўляецца па іх просьбе па месцу пастаяннага жыхарства бацькоў.

Жонкам (мужам) ваеннаслужачых афіцэрскага і начальніцкага саставу, а таксама сержантаў і старшын звыштэрміновай службы прадастаўляецца работа па месцу пастаяннага праходжання службы іх мужамі (жонкамі) пры наяўнасці там работы па спецыяльнасці.

На супругаў ваеннаслужачых тэрміновай службы, а таксама курсантаў ваенных вучылішчаў дзеянне гэтага пункта Палажэння не распаўсюджваецца.

Маладым спецыялістам — жанчынам, у выпадку цяжарнасці або калі яны маюць дзіця ва ўзросце да аднаго года, работа прадастаўляецца па месцу пастаяннага жыхарства сям'і (мужа, бацькоў).

Супругам, якія заканчваюць вышэйшыя або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы адначасова, работа прадастаўляецца на прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія размешчаны ў адным горадзе або раёне. Калі адзін з супругаў заканчвае навучальную ўстанову раней, то яму прадастаўляецца работа на агульных падставах, з улікам будучага накіравання на работу ў той жа раён (горад) другога супруга, калі ж пазней — па месцу назначэння супруга.

Пры ўступленні маладых спецыялістаў у шлюб пасля заканчэння работы камісіі месца работы супругаў вызначаецца па дагаворанасці паміж міністэрствамі або ведамствамі, на прадпрыемствах і ў арганізацыях якіх ім прадастаўляецца работа, а ў выпадку рознагалосся — міністэрствам або ведамствам, у распараджэнні якога знаходзіцца навучальная ўстанова, зыходзячы з найбольш мэтазгоднага выкарыстання маладых спецыялістаў.

Калі камісія па персанальнаму размеркаванню ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 12, 13, 14, 15 і 16 гэтага Палажэння, не можа прадаставіць работу маладому спецыялісту ў адпаведнасці з планам, яна накіроўвае маладога спецыяліста на работу па свайму меркаванню або па яго просьбе прадастаўляе магчымасць уладкоўвацца на работу самастойна.

Кіраўнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў абавязаны дапамагаць маладым спецыялістам, якім камісіяй па персанальнаму размеркаванню прадастаўлена магчымасць уладкоўвацца на работу самастойна, у падшуканні работы па спецыяльнасці.

Пасля заканчэння работы камісіі адхіліць або змяніць яе рашэнне можа толькі міністэрства.

Пасведчанне аб накіраванні на работу і грашовыя сродкі ўручаюцца маладым спецыялістам адначасова з дыпломам не пазней чым праз 5 дзён пасля заканчэння імі навучальнай установы. Персанальную адказнасць за своечасовае ўручэнне маладым спецыялістам пасведчанняў аб накіраванні на работу, грашовых сродкаў і дыпломаў нясуць кіраўнікі навучальных устаноў.

Даведкі аб прадастаўленні магчымасці самастойна ўладкоўвацца на работу (форма № 3) выдаюцца маладым спецыялістам у адпаведнасці з рашэннем камісіі па персанальнаму размеркаванню за подпісам кіраўніка навучальнай установы.

Спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй абавязаны працаваць пасля заканчэння навучання ў адпаведнасці з накіраваннем камісіі па персанальнаму размеркаванню і накіраваннем міністэрства (ведамства) не менш трох гадоў, акрамя тых спецыялістаў, для якіх устаноўлены ўрадам іншыя тэрміны работы.

Заўвага. Маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія прызваны ва Узброеныя Сілы СССР, час знаходжання ва Ўзброеных Сілах СССР залічваецца ў тэрмін абавязковай работы па накіраванню пасля заканчэння навучальнай установы.

Кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый на працягу 3 год пасля заканчэння маладымі спецыялістамі навучальнай установы забараняецца выкарыстоўваць іх у апараце кіраўніцтва, перамяшчаць на работы, якія не звязаны са спецыяльнасцю, а таксама звальняць з работы без дазволу міністэрства (ведамства), якому падпарадкавана данае прадпрыемства або арганізацыя.

Калі малады спецыяліст на працягу гэтага тэрміну па якой-небудзь прычыне не можа быць выкарыстан на прадпрыемстве або ў арганізацыі, куды ён накіраван камісіяй па персанальнаму размеркаванню, або прадпрыемства (арганізацыя) не забяспечвае выканання ўмоў працоўнага дагавору, зафіксаваных у пасведчанні аб накіраванні на работу, міністэрства (ведамства), у падпарадкаванні якога знаходзіцца данае прадпрыемства або арганізацыя, абавязана прадаставіць маладому спецыялісту ў сваёй сістэме іншую работу або па яго просьбе адкамандзіраваць на работу ў сістэму іншага міністэрства (ведамства) па ўзгадненню з гэтым міністэрствам (ведамствам).

Кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый забараняецца прымаць маладых спецыялістаў на работу да сканчэння трох год пасля заканчэння навучальнай установы без пасведчання адпаведнага міністэрства (ведамства) або даведкі навучальнай установы аб прадастаўленні магчымасці самастойна ўладкоўвацца на работу.

Кіраўнікі міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў і арганізацый нясуць адказнасць за правільнае выкарыстанне маладых спецыялістаў на рабоце ў адпаведнасці са спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, атрыманымі імі ў навучальных установах, а таксама за стварэнне ім неабходных жыллёва-бытавых умоў і ўмоў для хуткага набыцця практычнага вопыту і павышэння кваліфікацыі.

Маладыя спецыялісты забяспечваюцца жыллёвай плошчай прадпрыемствам (арганізацыяй), у якое яны накіраваны пры размеркаванні.

Маладыя спецыялісты, якія накіроўваюцца на работу ва ўстановы асветы, культуры і аховы здароўя, гандлю, бытавога абслугоўвання, суда і пракуратуры, у выпадку адсутнасці ведамаснай жыллёвай плошчы, забяспечваюцца жыллёвай плошчай мясцовымі Саветамі дэпутатаў працоўных па хадайніцтву адпаведных устаноў і арганізацый.

Усім маладым спецыялістам, якія накіроўваюцца на работу пасля заканчэння навучальнай установы, прадастаўляецца да пачатку работы месячны водпуск незалежна ад таго, калі яны мелі апошнія канікулы ў навучальнай установе.

За час водпуску маладому спецыялісту выплачваецца дапамога ў памеры месячнай стыпендыі за кошт прадпрыемства, у якое ён накіроўваецца на работу. Заработная плата за час водпуску не выплачваецца.

Маладым спецыялістам, якія атрымалі магчымасць самастойна ўладкоўвацца на работу, дапамога за час водпуску не выплачваецца.

# МОЖНА ГАНАРЫЦЦА

У Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга навукова-даследчым інстытуце бульбаводства і садавінагароднінаводства працуюць 22 выпускнікі біялагічнага факультэта нашага універсітэта. Многія з іх ужо абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Гэта А. М. Крэмнева, С. І. Бельская, Л. В. Бондар.

Святлана Іосіфаўна Бельская закончыла універсітэт у 1959 годзе і стала супрацоўнікам інстытута. У 1962 годзе яна паступіла ў аспірантуру пры інстытуце і пачала працаваць над дысертацыяй па важнай для сельскай гаспадаркі тэме «Вывучэнне пытанняў эпіфіталогіі фітафтарозу бульбы ў Беларусі». Святлана Іосіфаўна даследавала прычыны масавага захворвання бульбы фітафторай, унесла ўклад у арганізацыю мер барацьбы з ёю, распрацаваўшы метады прагнозу фітафторы ва ўмовах Беларусі, абгрунтавала і прапанавала фітасанітарныя мерапрыемствы па барацьбе з гэтым захворваннем. У цяперашні час С. І. Бельская займаецца вывучэннем бактэрыёзаў бульбы ў БССР.

У 1969 г. супрацоўніца гэтага ж інстытута, былая выпускніца нашага універсітэта Л. В. Бондар абараніла дысертацыю «Плямістасці яблыні ў БССР і распрацоўка спосабаў барацьбы з імі». Яна апублікавала 22 навуковыя работы. Зараз Л. В. Бондар—старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі імунітэту, працуе над праблемай устойлівасці яблыні да паршы.

Многія былыя выпускнікі БДУ цяпер займаюцца ў аспірантуры гэтага інстытута: гэта Р. Г. Попель, В. Д. Паліксенава, В. В. Сяргееў, І. В. Генералава, Н. А. Далматовіч і іншыя.

Н. А. Далматовіч, напрыклад, займаецца праблемай унутрывідавой спецыялізацыі ўзбуджальніка паршы яблыні. І. В. Генералава даследуе бактэрыяльныя захворванні бульбы.

Былыя выпускнікі з'яўляюцца аўтарамі розных даведнікаў, практычных рэкамендацый спецыялістам сельскай гаспадаркі Беларусі. Імі апублікавана каля 100 навуковых работ у рэспубліканскіх і саюзных выдавецтвах.

Універсітэт можа ганарыцца сваімі выпускнікамі.

**Л. КУНЕВІЧ,**
**студэнтка.**

# ШЭФСКАЯ РАБОТА — УДАРНАЯ СПРАВА КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА

**Іх з нецярпеннем чакаюць і ў далёкіх сельскіх школах, і ў дзіцячых пакоях домакіраўніцтваў г. Мінска. Яны—студэнты розных факультэтаў нашага універсітэта і... шэфы. А гэта значыць, людзі, якія ўмеюць дарыць радасць іншым, ахвяруючы нярэдка сваім вольным часам.**

**Зараз ва універсітэце ідзе месячнік шэфскай работы, прысвечаны XVII з'езду ВЛКСМ. Аб тым, як ён праходзіць, расказваюць гэтыя матэрыялы.**

## ПРАЦА, ПОШУК, ЭНТУЗІЯЗМ

*«Калі ты хочаш стаць добрым выхавацелем дзяцей — аддай ім сваё сэрца».*

*В. А. СУХАМЛІНСКІ.*

У ШЭФСКІМ СЕКТАРЫ камітэта камсамола БДУ працуе 18 чалавек — прадстаўнікі ўсіх факультэтаў. Ужо ў кастрычніку, адразу ж пасля сельскагаспадарчых работ, былі ўстаноўлены цесныя кантакты з выхавацелямі і загадчыкамі дзіцячых пакояў пры падшэфных домакіраўніцтвах, улічаны ўсе пажаданні і просьбы рабят. Адразу ж пасля сфарміравання педатрадаў, сумесна з членамі шэфскага сектара і прадстаўнікамі Кастрычніцкага райкома камсамола, прайшла вучоба камандзіраў і камісараў атрадаў. Рашэннем камітэта камсамола універсітэта шэфства было аб'яўлена ўдарнай справай камсамольцаў. І работа закіпела. У мінулым месяцы ў школах і домакіраўніцтвах прайшлі рэйды-праверкі работы піянерважатых і педагагічных атрадаў. На стол адзін за другім ляглі лісты справаздач.

Адказная за шэфскі сектар філалагічнага факультэта **Тамара КАБАН:**

— Другі год працуюць на факультэце педагагічныя атрады. Студэнты, будучыя педагогі, ахвотна ідуць да дзяцей, радуюцца і дзеці сустрэчы са сваімі шэфамі. У кожным з домакіраўніцтваў ёсць свае бібліятэка, ігратэка, піянерскі пакой, у якім 3—4 разы ў тыдзень дзяжураць педатрадаўцы. Амаль усюды працуюць гурткі: танцавальныя, мастацкага чытання, спеваў. Цікава прайшлі гутаркі «Мы любім кнігу», «Чаму гарбуз паласаты?», «Раскажу пра школу і дом». У дзіцячых пакоях праходзяць конкурсы на лепшы матэрыял для насценнай газеты, на лепшы малюнак, фотаздымак. Кожны месяц у Акруговым Доме афіцэраў праводзяцца ўрачыстыя ранішнікі «Прысязе бацькоў верныя».

Частымі гасцямі бываюць трэцякурснікі ў Красненскай СШ. У лістападзе ў школе прайшоў вечар на тэму «Твая дарога ў жыццё», на якім нашы філолагі дзяліліся ўражаннямі аб вучобе ва універсітэце. Сумесна са старшакласнікамі быў дадзен вялікі канцэрт.

**Надзя ШАЎЧЭНКА,** гістарычны факультэт:

— Работа ў нас праводзіцца ў трох кірунках: па месцу жыхарства, у Мінскай СШ №52, у Засульскай школе Стаўбцоўскага раёна. На факультэце арганізавана шэсць педатрадаў. Дзяўчаты працуюць піянерважатымі ў 4—6 класах школы № 52, у Засульскай сярэдняй школе працуе гурток «Наш Ленінскі камсамол». Прачытаны чатыры лекцыі — аб міжнародным становішчы і па пытаннях этычнага выхавання.

Наладзіўшы цесную сувязь з домакіраўніцтвамі і школамі, мы адчулі: нам не хапае кантактаў з арганізацыямі і прадпрыемствамі, якія шэфствуюць над тымі школамі, што і мы. І цяпер, узгадняючы нашы планы, намнога лягчэй стала працаваць: што не па сілах студэнтам, тое могуць зрабіць нашы старэйшыя таварышы, і наадварот.

З 26 сакавіка на факультэтах праводзяцца дні адкрытых дзвярэй. Гасцямі студэнтаў будуць піянеры і школьнікі падшэфных школ, дзеці з домакіраўніцтваў. Сумесна з шэфскімі сектарамі факультэтаў у нас выпрацаваны канкрэтныя планы мерапрыемстваў на кожны дзень вясновых канікул з тым, каб як мага больш змаглі ўбачыць нашы малодшыя сябры, як мага лепш азнаёміліся са студэнцкім жыццём. Тыдзень адкрытых дзвярэй супаў і з правядзеннем месячніка шэфскай работы, мэта якога — актывізаваць работу з падшэфнымі, дабіцца таго, каб ні адзін падлетак з домакіраўніцтваў не бадзяўся без мэты па вуліцы, кожны меў любімую справу.

Побач з тым добрым, што намі зроблена, нямала і недахопаў. Многія факультэты работу праводзяць толькі ў плане чытання лекцый, што недастаткова. Усё яшчэ не могуць раскачацца журналісты, географы, фізікі. З гэтых факультэтаў нават самых адказных выклікаць на пасяджэнне сектара вельмі цяжка. Калі гістарычны, філалагічны факультэты ўжо заслухалі ў камітэтах камсамола справаздачу аб рабоце шэфскіх сектараў, то на юрыдычным, фізічным, геаграфічным усё яшчэ толькі «мяркуецца». Адсюль і вынікі.

Часта многае залежыць і ад домакіраўніцтваў, але асноўная сіла — самі студэнты. Там, дзе камсамольскі запал, дзе прага адкрыць дзіцячую душу сапраўдныя, там заўсёды поспех.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**член камітэта камсамола універсітэта.**



## СТАРЭЙШЫЯ СЯБРЫ

**Вось ужо другі год у дзіцячым пакоі па вуліцы Маскоўскай, 1/2, працуюць студэнты ФПМ. Камандзір педагагічнага атрада — Таня Мінаева, студэнтка II курса.**

**Многа добрых спраў зроблена за гэты час камсамольцамі. У дзіцячым пакоі праводзяцца гутаркі, чытаюцца лекцыі, афармлены фотавітрыны, створаны гурткі, працуе бібліятэка...**

**Два гады ўзначальвае танцавальны гурток Люба Логінава. «Рускі танец», «Лявоніху» вытанцоўвалі дзяўчынкі перад жыхарамі свайго домакіраўніцтва і ў сваёй школе. А нядаўна іх цёпла сустракалі жыхары вёскі Ляхавічы Дзяржынскага раёна. Тады танцавальны гурток быў уключан у састаў агітбрыгады ФПМ, якая рабіла чарговы выезд у падшэфную школу.**

**Асаблівай папулярнасцю у хлопчыкаў карыстаецца фотагурток. Вядзе яго Генадзь Літвінаў. Дзяўчынкі ж заўсёды застаюцца дзяўчынкамі. Ім падабаецца гурток «Умелыя рукі». А вось у малады турысцкі гурток запісаліся і дзяўчынкі, і хлопчыкі.**

**«Малайцы, рабяты!» — хваліць сваіх памочнікаў выхавацель дзіцячага пакоя Людміла Пятроўна Гарошка.**

**Л. МАЛЬКОВА,**
**студэнтка ФПМ.**

## УРОК НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Мусіць, усе студэнты-філолагі, будучыя настаўнікі, заўсёды з вялікім хваляваннем і нецярпеннем чакаюць час педагагічнай практыкі, калі яны дадуць свае першыя ўрокі, адчуюць сябе настаўнікамі. Не сакрэт, што і мы, студэнты вячэрняга аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры, чакалі... Яшчэ ў пачатку верасня на кароценькіх перапынках паміж лекцыямі можна было пачуць гаворку аб школе, будучых уроках...

Але ж як хутка бяжыць час! Здалі сесію. Прамільгнулі канікулы. І вось у актавай зале філалагічнага факультэта ідзе сход студэнтаў-практыкантаў. З добрымі парадамі і пажаданнямі выступаюць вопытныя педагогі, кіраўнік педагагічнай практыкі Алена Андрэеўна Скачко. На сходзе мы былі размеркаваны па групах і накіраваны ў розныя школы Мінска.

Наша група — студэнты Н. Алькіна, І. Іванова, В. Баброўская, В. Ахрамовіч, Г. Доўнар і я пад кіраўніцтвам метадыста Вячаслава Васільевіча Каладзінскага атрымала накіраванне ў ШРМ № 28, у якой займаюцца рабочыя заводаў імя Вавілава, гадзіннікавага, будаўнічага трэста № 3.

Першыя дні мы знаёміліся са школай, прысутнічалі на ўроках беларускай і рускай мовы і літаратуры, а таксама на ўроках матэматыкі, фізікі, хіміі.

Школа адразу зрабіла на нас найлепшае ўражанне. Чыстыя, прасторныя класы, добра абсталяваныя кабінеты і лабараторыі, самае галоўнае,—увага да нас з боку выкладчыкаў, іх жаданне дапамагчы нам, падзяліцца сваім багатым вопытам.

Мінуў тыдзень. І ўжо ў якасці настаўнікаў мы, студэнты-вячэрнікі, прыйшлі ў класы да вучняў, якія таксама працуюць і вучацца.

Надоўга нам запомніцца першы ўрок Н. Алькінай у 9 «А» класе. Хвалявалася Наташа, хваляваліся і мы — яе сябры. Гэта быў не толькі першы ўрок, гэта быў як бы пачатак выпрабавання ўсіх нас. Урок атрымаўся. Наташа здзівіла ўменнем трымацца, парадавала грунтоўнай падрыхтоўкай.

А потым практыкаваліся ўсе астатнія. Усяго далі 28 урокаў. Але гэта не надта многа. Хацелася б, каб заўтрашнія пяцікурснікі-практыканты мелі магчымасць даць урокаў значна больш, каб яны маглі прыйсці ў школу ўжо на IV курсе, пабыць у класах і прыглядзецца да работы настаўнікаў, а праз год адразу даваць урокі.

Пасля нашых урокаў заўсёды праводзіліся абмеркаванні. Выступалі, указвалі на недахопы і памылкі, адзначалі станоўчае, рабілі вывады. Рахунак падводзіў наш кіраўнік. Яго заключнае слова заўсёды было важкім і аб'ектыўным. Нагул, ён шмат патрабаваў ад нас, але нам жа на карысць, як мы змаглі пераканацца, правёўшы па некалькі ўрокаў. І ўсюды паспяваў: прысутнічаў на ўроках, гутарыў з вучнямі, быў галоўным арганізатарам вечара-сустрэчы з замежнымі студэнтамі.

Вечар гэты адбыўся ў актавай зале школы. Гасцей вітала дырэктар школы З. К. Хабарава, з паведамленнем аб знешняй палітыцы нашай партыі пасля XXIV з'езда КПСС выступіла студэнтка-практыкантка, сакратар камсамольскай арганізацыі гадзіннікавага завода Галіна Доўнар. Замежныя студэнты расказалі аб сваіх краінах: В'етнаме, Бангладэш, Самалі, аб сістэмах адукацыі ў іх. Вечар быў ва ўсіх адносінах цікавым і карысным. І не толькі для вучняў, але для нас і гасцей. Яны пазнаёміліся з вячэрняй школай, прысутнічалі на ўроку рускай літаратуры, які якраз давялося праводзіць мне. Тлумачыў тэму «Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны». Гэты ўрок мне не забыць ніколі ў жыцці. Вядома, хваляваўся, не ўсё атрымалася так, як хацеў. Але ўрок, як можна было меркаваць па выказваннях выкладчыкаў і гасцей, спадабаўся.

Нядаўна мы правялі гутаркі з вучнямі. І. Іванова расказала пра наш універсітэт, Г. Доўнар — аб гадзіннікавым заводзе, Н. Алькіна — пра чылійскага змагара за свабоду, спевака Віктара Хару. Аб героях, імёнамі якіх названы вуліцы Мінска, была гутарка В. Баброўскай. Гутарку па эстэтыцы правяла В. Ахрамовіч. Я расказаў вучням аб сучаснай беларускай паэзіі.

Практыка закончылася. Але мы не раз яшчэ вернемся да яе, думаючы аб сваёй будучай педагагічнай дзейнасці, робячы такія важныя ў нашай далейшай вучобе вывады аб жыцці, школе.

А пакуль бясспрэчна адно — практыка дала нам шмат. Мы пазнаёміліся бліжэй са школай, мелі магчымасць хоць колькі сваіх ведаў, атрыманых за пяць гадоў навучання ва універсітэце, перадаць вучням. Галоўнае ж, што яна ясна ўказала на тое, што нам яшчэ патрэбна многа вучыцца і працаваць над сабой.

**В. ПАЗНЯК,**
**студэнт V курса вячэрняга аддзялення філфака.**

## РАДАСЦЬ СУСТРЭЧ

Ведаеце, якая грамадская работа самая цікавая? Шэфская. Гісторыкі згаджаюцца з гэтым адразу, бо хутка школа стане нашым домам, а вучні—«зусім сваімі» хлопчыкамі і дзяўчынкамі. І будзем хадзіць з імі ў паходы, арганізоўваць вясёлыя гульні. старанна і карпатліва рыхтавацца да ўрокаў. Гэта на нас кожны дзень будуць накіраваны погляды цікаўных, дапытлівых, шырока раскрытых дзіцячых вачэй.

Гэта адказна — быць настаўнікам. І гэта будзе зусім-зусім хутка. Таму няма неабходнасці паўтараць гісторыкам: «Шэфская работа — ударная справа камсамольскай арганізацыі». Гэта разумеюць самі і Каця Далько, і Света Манастырская, Віктар Рудэнка і Рыгор Лотак. Наташа Малахоўская, Віктар Плужнікаў і іншыя. Аб гэтым заўсёды помняць студэнты II курса аддзялення філасофіі, якія ўзялі шэфства над Засульскай сярэдняй школай Стаўбцоўскага раёна.

Нашы сувязі з яе вучнямі мацнеюць з дня ў дзень, а таму і сустрэчы нашы — сяброўскія, цёплыя. Тры разы пабывалі ў Засульскай школе нашы лектары, агітбрыгада. Піянерскі пакой атрымаў у падарунак ад гісторыкаў невялікую бібліятэчку.

Зразумела, заўсёды з задавальненнем едзеш туды, дзе цябе чакаюць, дзе табе рады.

Агітбрыгада мае сваіх энтузіястаў. Гэта Лена Худзіцкая, Васіль Жукаў, Света Мацюшонак, Людміла Шульга, Аляксандр Вараўка, Людміла Зайцава.

У бліжэйшы час мы дапаможам нашым сябрам у афармленні піянерскіх куткоў, прачытаем лекцыі, прысвечаныя 50-гсддзю прысваення піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна, цыкл лекцый «Выхоўваць выхаванасць», пакажам новы спектакль тэатра мініяцюр. З нецярпеннем чакаем мы да сябе ў госці вучняў Апечкаўскай і Засульскай школ у час вясновых канікул. Будзем і самі ў іх яшчэ не адзін раз.

**Н. ШАЎЧЭНКА,**
**студэнтка II курса аддзялення філасофіі.**

*27 САКАВІКА АДЗНАЧАН МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА*

# «ВОСЬМЫ КОЛЕР ВЯСЁЛКІ»

...Ён гаварыў ёй:

— Я абараню цябе ад усяго і ад усіх, хто захоча цябе пакрыўдзіць.

І яшчэ ён тварыў цуды. Людзі раптам станавіліся добрымі і чулымі альбо з нябёс падалі кветкі.

Алег кахаў Лену, а калі кахаеш па-сапраўднаму, можна ўтварыць любы цуд...

П'еса І. Альшанскага «Восьмы колер вясёлкі» хутка з'явіцца на сцэне БДУ. Кіраўнік студэнцкага тэатра Аляксандр Міхайлавіч Озераў праводзіць адну з заключных рэпетыцый. Ён пільна сочыць за дзеяннем, робіць заўвагі. Шліфуецца кожны рух, слова, кожная сцэна. Раз-пораз у вачах Аляксандра Міхайлавіча мільгае задавальненне. Рабяты іграюць шчыра, з захапленнем...

— Да п'есы І. Альшанскага мы звярнуліся невыпадкова, — Аляксандр Міхайлавіч перагортвае старонкі тэксту. — Раней у тэатры ставіліся спектаклі патрыятычнага плана, звязаныя з вайной. Па-мойму, настала неабходнасць расшырыць рэпертуар, паказаць магчымасці тэатра ў розных жанрах.

«Восьмы колер вясёлкі»— камедыя. Камедыя вясёлая і сумная, як само жыццё. Як і ў іншых папярэдніх работах, тут ідзе бой паміж сіламі дабра і зла, ідзе бой з мяшчанствам, бой за чалавека.

Нельга пераказаць твор. У ім шмат гумару, нечаканасцей і, канешне, — лірыкі. Гэта, як вызначыў Аляксандр Міхайлавіч, — п'еса аб тым, што трэба рабіць людзей шчаслівымі. Толькі тады і сам ты будзеш шчаслівы.

...Ёй было цяжка адвыкнуць ад мяшчанскіх звычак. Але побач быў ён. Толькі ў канцы Лена зможа сказаць:

— Я была шчаслівая... Гэта так, Алег, я толькі цяпер гэта зразумела. Таму што ты мяне ўзнагародзіў сваім каханнем. Больш узнагародзіў, чым я таго была варта...

Дабро нясе ў адказ дабро. Адзін цуд выклікае другі. А што такое «восьмы колер вясёлкі»? Гэта колер цуда, гэта мара аб вялікім шчасці для другога чалавека.

У спектаклі іграюць студэнты, якіх мы даўно палюбілі за прафесійны артыстызм, майстэрства,—А. Касцецкі, Н. Дудзейка, Н. Пекарская, Л. Дубікава і іншыя. Праца ў студтэатры прыносіць ім задавальненне, радасць, асалоду. У будучым гэты ж састаў прыступіць да работы над новым спектаклем — драмай К. Чапека «Маці».

А пакуль што рэпетыцыя працягваецца.

...Лена зразумела ўсё. І калі Алегу спатрэбілася падтрымка, ён знайшоў яе. «Хай ужо нічога не будзе, хай лепей я памру, толькі каб не жыць так. Я не згодна жыць без цуда», — гаворыць яна, і глядач разумее, якая тут адбылася перамога.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



**Абуджэнне вясны.** Фотаэцюд **Д. Чаховіча.**

**СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ**

# *ДОБРЫЯ ЗМЕНЫ*

Пасля таго, як камендантам стаў Уладзімір Іванавіч Сцяпанаў, жыццё ў інтэрнаце № 4 на Паркавай магістралі прыкметна змянілася. Больш актыўна ўзяўся за работу студэнцкі савет. Рэгулярна пачала выходзіць насценгазета, дзе змяшчаюцца цікавыя творы пачынаючых паэтаў і іншыя матэрыялы. Сатырычная газета «Мятла» бязлітасна выкрывае парушальнікаў студэнцкага рэжыму. Стала традыцыяй праводзіць сустрэчы з цікавымі людзьмі. У мінулым годзе перад студэнтамі выступіў з канцэртам артыст Белдзяржфілармоніі М. Шмелькін. Студсавет арганізаваў сустрэчу з маладымі беларускімі паэтамі. Госцем студэнтаў быў дацэнт юрфака У. П. Сярэбранікаў. Ён расказаў аб Францыі, дзе быў на працягу года на стажыроўцы.

Зусім нядаўна перад студэнтамі з лекцыяй аб сучаснай замежнай літаратуры выступіла дацэнт І. В. Шаблоўская.

Зараз у ленінскім пакоі дэманструецца выстаўка работ студэнтаў - мастакоў, якія жывуць у інтэрнаце.

**М. ЗУЕЎ,**
студэнт філфака.

Са святам вас, дарагія таварышы студэнты і выкладчыкі! Жэня (Толік, Вова, Пеця, Віктар Іванавіч), у цябе (у Вас) уся спіна белая. З 1 красавіка цябе (Вас)! І мяне (нас) таксама!



Сёння і на нашым факультэце свята. Нарэшце ж, 1 красавіка — дзень нараджэння ФПМ.

На вуліцы вясна, заціхлі хваляванні мінулай сесіі, пакуль яшчэ не выклікаюць ліхаманкавых дрыжыкаў назвы экзаменаў наступнай — таму настрой у рэдакцыі бадзёры, вясёлы, адным словам, самы першакрасавіцкі.

На ФПМ ужо стала традыцыяй, што 1 красавіка дошка аб'яў напамінае рознакляровую мазаіку: пішуць усе, каму хочацца і ў каго ёсць папера. Таму з мэтай памяншэння колькасці непаразуменняў напярэдадні 1 красавіка рэдакцыя зараней абвяргае чуткі аб тым, што за каманду ФПМ у першынстве БДУ па баскетболу выступалі тры незаяўленыя ігракі зборнай СССР; што з наступнага семестра стыпендыя на нашым факультэце ўзрасце ўтрая, а колькасць экзаменаў у сесію паменшыцца ўдвая; і што ад перамены месцаў складаемых сума не мяняецца. А, акрамя таго, заяўляе, што за ўсё надрукаванае ў святочным нумары газеты «Алгарытм», яна адказнасці не нясе.

Толік (Жэня, Вова, Пеця, Віктар Іванавіч), у цябе (у Вас) шнуркі развязаліся!

З 1 красавіка!!!

**Адміністрацыя клуба.**




Два маладыя адзінокія студэнты здымуць на працяглы тэрмін стыпендыю. Даведкі ў дэканаце.

* * *

З 1 красавіка на ФПМ уводзіцца свабоднае наведванне.

* * *

Студэнтцы П. Матандрак тэрмінова забраць дакументы ў дэканаце. У адваротным выпадку яна будзе дапушчана да летняй экзаменацыйнай сесіі.

* * *

Навучаю сну па сістэме ёгаў. Цвікі з сабой!

Таварышы студэнты!

1 красавіка 1974 года ў камітэце камсамола ФПМ можна будзе аформіць гадавую падпіску на газету «Алгарытм» і яе дадатак — часопіс «Вакол свету». Падпіска прымаецца ўсімі ўпаўнаважанымі без усякіх абмежаванняў і без усякіх гарантый.

* * *

Да ўвагі студэнтаў і выкладчыкаў ФПМ!

Для зручнасці ўводзіцца новы парадак: цяпер вы зможаце купіць піражкі з мясам і булачкі з макам прама ў дэканаце. На кафедры МЗ ЭВМ прыступілі да манціравання аўтаматаў з газіраванай вадой.




## З ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ КВАЗІ

*Выкарыстоўваючы шпаргалку, сачыце, каб яна правільна асвятлялася, інакш вы можаце сапсаваць сабе зрок.*

*Неразумна сядзець на лекцыях і гуляць у крыжыкі і нулікі; з большай карысцю вы правядзеце гэты час у тэатры, кіно або проста на свежым паветры.*

* * *

*АПТЫМІСТ — студэнт, які размеркаваўся на кафедру метадаў аптымальнага кіравання.*

*ЗАБЯГАЛАЎКА — асенні крос.*

*РАЗГРОМ — першая навальніца.*

*ТЫЧЫНКА—прамы справа (бокс).*

*ПЕСЦІК — выхавацельніца дзіцячага сада.*

* * *

**Першага красавіка факультэт прыкладной матэматыкі нашага універсітэта адзначае чацвёртую гадавіну з дня свайго нараджэння. Мы шчыра віншуем усіх студэнтаў і выкладчыкаў са святам! А нашым чытачам прадстаўляем матэматыкаў у незвычайным амплуа — гумарыстаў. Так, на ФПМ любяць гумар і ўмеюць жартаваць. Аб гэтым сведчаць матэрыялы Дэльта-клуба.**

*Малюнкі студэнта журфака А. Цыгулёва.*




# ЯК ЗДАВАЦЬ ФІЗІКУ

Для паспяховай здачы экзамена абсалютна неабходны: здольнасць знайсці дарогу ва універсітэт пасля шасці дзён бесперапыннага гартання ў розных напрамках падручнікаў Савельева; уменне беспамылкова вызначыць, хто з прысутных у аўдыторыі — твой выкладчык; цвёрдая ўпэўненасць у тым, што Фарадэй добрасумленны чалавек, дыёд зусім не знявага і $E=mc^2$.

Перад уваходам у аўдыторыю пастарайцеся ўспомніць, як ваша прозвішча і на якім курсе вы займаецеся — гэта пакідае ў баку хваляванні. Людзі, якія сабраліся ля дзвярэй, як правіла, у большасці сваёй — вашы таварышы па групе. Паспрабуйце іх пазнаць — гэта цікава.

Пастарайцеся ўспомніць хоць адну формулу з учора прачытаных. Калі вам гэта не ўдасца — усё ў парадку, ваш мозг нармальна функцыяніруе і гатоў да работы.

Але вось дзверы расчыніліся, і штосьці ў страўніку падказала — пара. Гэта крытычны момант. Збярыце ў левы кулак усю сваю волю і, утрымліваючы ад дрыготкі правай рукой ніжнюю чэлюсць, смела ўваходзьце. Памятайце, па вашаму першаму «д-доб-р-ры дзень» аб вас ствараецца нейкае папярэдняе ўражанне, якое цяжка згладзіць, нават самастойна склаўшы і рашыўшы ўраўненне Шрэдынгера. І яшчэ, калі ў ходзе экзамена выкладчык не згодны з вашым адказам—не адчайвайцеся: Эйнштэйна таксама не ўсе разумелі. Ну вось і ўсё. Удачы (здачы) вам!

## СТУДЭНТЫ ЖАРТУЮЦЬ

На камісіі па размеркаванню ў інстытуце фізкультуры:

— Цудоўна, пасылайце мяне ў вёску, — сказаў выпускнік, — толькі... у алімпійскую.

* * *

Ля дзвярэй аўдыторыі, дзе ідуць уступныя экзамены, размаўляюць два абітурыенты:

— Ёсць толькі адно пытанне, на якім я магу зрэзацца.

— Якое?

— Якое дастанецца мне.

* * *

Аб здольным выпускніку вну, дыпломніку, упэўнена гаворачы: «Гэты далёка пойдзе...», ніхто чамусьці не сказаў: «Гэты далёка паедзе».

* * *

У аўдыторыю, дзе ідзе экзамен, забягае студэнт.

— Пастаўце мне двойку, прафесар, і я пайду.

— Паслухайце, паважаны, вы ж мне не адказвалі, як жа я магу паставіць двойку!

— Я прашу вас, пастаўце «нездавальняюча».

— А можа вы ведаеце на большае? Я не магу вам паставіць двойку.

— Прафесар, усё-такі.

— Не і не!

— Ну, добра, угаварылі! Стаўце тады тройку.

* * *

Прафесар: — Нічога з вас, баценька, не атрымаецца... А вось Аляксандр Македонскі ў вашы гады пакарыў палову вядомага тады свету.

Студэнт: — Дык у яго ж настаўнікам быў Арыстоцель!..

* * *

Прафесар: — Вазьму грэх на душу, пастаўлю вам тройку.

Студэнт: — Стаўце тады чацвёрку, абодва возьмем па граху.

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Телефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарнявыдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 11082

Зак. 406